Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
______________ А. А. Корбут
«_____»_____________2017 г.
Рэгістрацыйны № ВД-___/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# УВОДЗІНЫ Ў СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць*

2017

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандартувышэйшай адукацыі ОСВО 1-23 01 14-2013 і вучэбнага плана па спецыяльнасці 1-23 01 14Сацыяльна-культурная дзейнасць,рэгістрацыйны № 1-23-1-16/13 вуч. ад 27.06.2013

**СКЛАДАЛЬНІК**

*А.П.Байко,* старшы выкладчык кафедры педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Ю. А. Пераверзева,* загадчык аддзела камплектавання фондаў дзяржаўнай установы «Нацыянальная бібліятэка Беларусі», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*М. М. Каралёў,* дэкан факультэта культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

кафедрай педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 24.10.2015 г.);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 18.06.2016 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А. П. Байко

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Прафесійная арыентацыя студэнтаў, разуменне імі сутнасці прафесіі, усвядомленае, сур'ёзнае стаўленне да прафесійнай падрыхтоўкі спрыяюць хутчэйшаму і, галоўнае, больш якаснаму фарміраванню спецыяліста ў сучасных умовах. Гэта і вызначае важнасць вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў спецыяльнасць», якая прафесійна арыентуе студэнтаў, дазваляе атрымаць досыць поўнае ўяўленне аб сваёй спецыяльнасці і будучай прафесіі, хутчэй адаптавацца да новых умоў вучобы ва ўніверсітэце. Студэнты атрымліваюць першапачатковыя веды аб сутнасці, спецыфіцы прафесіі спецыяліста па сацыяльна-культурнай дзейнасці, інфармацыю аб досыць складанай сістэме яго падрыхтоўкі ваУВА.

Праграма вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў спецыяльнасць» скіравана на тое, каб, даючы першапачатковыя, самыя агульныя веды аб спецыяльнасці і прафесіі, у працэсе навучання пазнаёміць студэнтаў з прыёмамі авалодання прафесіяй, элементамі навукова-даследчай дзейнасці.

**Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый спецыяліста**

Спецыяліст павінен:

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця, самастойна прымаць прафесійныя рашэнні, аналізаваць гістарычныя і сучасныя праблемы эканамічнага і сацыякультурнага жыцця грамадства.

**Патрабаванні да сацыяльна-асобасныхкампетэнцый**

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

САК-6. Умець працаваць у камандзе.

**Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый спецыяліста**

Спецыяліст павінен быць здольным:

ПК-2. Выкарыстоўваць нарматыўна-прававую базу галіны культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-8. Набываць новыя веды, выкарыстоўваючы сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі.

ПК-9. Ацэньваць стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця сферы культуры і мастацтваў.

*Мэта*вучэбнай дысцыпліны – стварэнне аб'ектыўных умоў для разумення студэнтамі першага курса кампанентаў прафесійнай кампетэнтнасці для паспяховай працы на пасадах, якія адпавядаюць спецыяльнасці; выбару імі кірункаў спецыялізацыі ў час навучання ва ўніверсітэце; усведамлення сваіх жыццёвых мэт, месца ў новай эканамічнай і сацыяльнай рэальнасці.

*Асноўныя задачы*, якія рэалізуюць дадзеную мэту:

– даць аб'ектыўнае ўяўленне аб кампанентах прафесійнай кампетэнтнасці і відах прафесійнай дзейнасці спецыяліста сацыяльна-культурнай дзейнасці;

– пазнаёміць з тэхналогіямі атрымання ведаў, уменняў і спецыяльных навыкаў ва ўніверсітэце;

– фарміраваць асновы сучаснай арганізацыйнай культуры, ашчаднага выкарыстання часу для самастойнай работы, самаадукацыі ў сферы культуры.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен*ведаць:*

– напрамкі спецыяльнасцей і спецыялізацыі ў галіне сацыяльна-культурнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь;

– пералік і назначэнне асноўных устаноў сацыякультурнай сферы (дзяржаўнага, грамадскага і камерцыйнага сектараў);

– асноўныя патрабаванні, кваліфікацыйную характарыстыку і кампетэнцыі спецыяліста;

– асаблівасці арганізацыі вучэбна-творчай і навуковай работы студэнта;

– свае правы і абавязкі, патрабаванні да арганізацыі культуры быту ў інтэрнацкай установе;

*умець:*

– арыентавацца ў сістэме ведаў аб прафесійным асяроддзі;

– працаваць з навуковай, вучэбнай, даведачнай літаратурай,выкарыстоўваць сучасныя інфармацыйныятэхналогіі;

– рацыянальна арганізоўваць вучэбны і вольны час;

– скласці партфоліа і весці дзённік назіранняў;

– аргументаваць уласную думку;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*валодаць:*

– катэгарыяльным апаратам у галіне сацыяльна-культурнай дзейнасці;

– метадамі працы са спецыяльнай літаратурай.

Структура зместу вучэбнай дысцыпліны ўключае 6 тэм. Па кожнай тэме ў адпаведнасці з яе мэтамі і задачамі па фарміраванні і развіцці ў студэнтаў дакладных кампетэнцый выкладчыкам праектуюцца і рэалізуюцца пэўныя педагагічныя тэхналогіі. Сярод найбольш перспектыўных і эфектыўных сучасных адукацыйных сістэм і тэхналогій, якія дазваляюць рэалізаваць сістэмна-дзейнасны кампетэнтнасны падыход у вучэбна-выхаваўчым працэсе, выдзяляюцца: вучэбна-метадычныя комплексы, варыятыўныя модулі самастойнай працы студэнтаў, інфармацыйныя тэхналогіі, методыкі інтэрактыўнага навучання.

Вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў спецыяльнасць» усяго прадугледжана 63 гадзіны, з іх 36 гадзін аўдыторных заняткаў. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін: 12 гадзін – лекцыі, 24 гадзіны – практычныя.

Рэкамендаванай формай кантролю ведаў з'яўляецца залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Тэма 1. Уводзіны. Мэта, задачы вучэбнай дысцыпліны. Прафесія «спецыяліст па сацыяльна-культурнай дзейнасці, выкладчык»*

Патрабаванні грамадства да сучаснага спецыяліста ў галіне сацыяльна-культурнай дзейнасці. Агульныя звесткі аб кірунках падрыхтоўкі па спецыяльнасці «сацыяльна-культурная дзейнасць». Мэта і задачы курса «Уводзіны ў спецыяльнасць».

Кірункі і змест прафесійнай дзейнасці спецыяліста па засваенні, захаванні, стварэнні і распаўсюджванні каштоўнасцей культуры; па выяўленні інтарэсаў і патрэбнасцей насельніцтва ў розных відах адпачынку; па распрацоўцы сацыяльна-культурных праграм і праектаў арганізацыі вольнага часу для іх рэалізацыі ва ўстановах культуры і мастацтва рознага профілю.

Перспектывы працы выпускнікоў у сярэдніх і вышэйшых навучальных установах; сацыякультурных цэнтрах, на прадпрыемствах, фірмах і ў кампаніях, дзяржаўных органах, навукова-даследчых інстытутах з улікам спецыялізацый «арганізацыя і методыка сацыяльна-культурнай дзейнасці ва ўстановах культуры і адпачынку», «арганізацыя і методыка сацыяльна-культурнай дзейнасці ў тэатральна-відовішчных установах», «арганізацыя і методыка сацыяльна-культурнай дзейнасці ў санаторна-аздараўленчых і турысцка-спартыўных установах».

Магчымасць працягу адукацыі ў магістратуры і аспірантуры.

## *Тэма 2. Спецыяльнасць «сацыяльна-культурная дзейнасць» у кантэксце сусветнай і айчыннай вучэбна-навуковай практыкі*

Задачы прафесійнай сацыякультурнай адукацыі. Характарыстыка сучаснага этапу яе развіцця ў свеце. Праграмы падрыхтоўкі і кваліфікацыйныя ўзроўні выпускнікоў у беларускай вышэйшай школе.

Гісторыя ўніверсітэта і перспектывы яго развіцця. Сучасная арганізацыйная структура ўніверсітэта, кірункі вучэбнай, навуковай і выхаваўчай працы. Самакіраванне ва ўніверсітэце. Уклад выпускнікоў універсітэта ў развіццё тэорыі і практыкі сацыяльна-культурнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праграма вышэйшай прафесійнай адукацыі па падрыхтоўцы спецыялістаў сацыяльна-культурнай сферы, якая рэалізуецца ва ўніверсітэце. Спецыялізацыі па спецыяльнасці «сацыяльна-культурная дзейнасць»: «арганізацыя і методыка сацыяльна-культурнай дзейнасці ва ўстановах культуры і адпачынку», «арганізацыя і методыка сацыяльна-культурнай дзейнасці ў тэатральна-відовішчных установах», «арганізацыя і методыка сацыяльна-культурнай дзейнасці ў санаторна-аздараўленчых і турысцка-спартыўных установах».

Формы і віды дадатковай прафесійнай сацыяльна-культурнай адукацыі.

Дзяржаўны адукацыйны стандарт вышэйшай прафесійнай адукацыі па спецыяльнасці «сацыяльна-культурная дзейнасць»як аснова адзіных патрабаванняў да прафесійных кампетэнцый выпускніка.

Структура базавага вучэбнага плана падрыхтоўкі спецыялістаў па сацыяльна-культурнай дзейнасці. Пералік і кароткі змест вывучаемых цыклаў і дысцыплін: агульных гуманітарных; агульнапрафесійных; спецыяльных. Дысцыпліны, якія даюцца на выбар. Вытворчая практыка. Вучэбна-метадычныя комплексы і хрэстаматыйныя матэрыялы па дысцыплінах.

Каляндарны графік вучэбнага працэсу на бягучы год.

Скразная сацыяльна-культурная падрыхтоўка (практыкум) спецыялістаў па сацыяльна-культурнай дзейнасці ва ўніверсітэце. Прафесарска-выкладчыцкі склад выпускаючай кафедры – кафедры педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці. Вучэбныя дысцыпліны, якія выкладаюць прафесары і дацэнты кафедры. Спецыфіка прафесійнай падрыхтоўкі па спецыяльнасці «сацыяльна-культурная дзейнасць»ва ўніверсітэце.

### *Тэма 3. Установа сацыяльна-культурнай сферы як сацыяльны інстытут*

Установы сацыяльна-культурнай сферы розных тыпаў: *культуры і адпачынку* (клубы, дамы і палацы культуры, паркі культуры, кінатэатры, музеі, бібліятэкі, цэнтры маладзёжнага адпачынку, гульнятэкі, дамы мастацкай і тэхнічнай творчасці і інш.); *тэатральна-відовішчныя* (тэатры, філармоніі, цыркі, канцэртныя залы і г. д.); *санаторна-аздараўленчыя і турысц-*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*ка-спартыўныя* (санаторыі, пансіянаты, дамы адпачынку, прафілакторыі, палацы спорту, спартыўныя залы, стадыёны, басейны, пляжы, тэнісныя корты і інш.; турысцкія базы, турысцкія гасцініцы, кемпінгі, турысцкія паязды і параходы, турысцкія фірмы і інш.). Арганізацыйная структура базавай установы і сістэма планавання. Асноўныя дакументы ўліку і справаздачнасці. Сістэма і структура розных арганізацый, мастацкіх калектываў і клубных аб'яднанняў сацыякультурнай сферы.

### *Тэма 4. Прафесійная кампетэнтнасць – аснова канкурэнтаздольнасці спецыяліста*

Суадносіны паняццяў «пасада», «кваліфікацыя», «кампетэнцыі», «спецыяльнасць», «спецыялізацыя», «прафесія». Кампаненты прафесіянальнай кампетэнтнасці і віды прафесійнай дзейнасці спецыяліста па сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Прафесійна важныя якасці, неабходныя сучаснаму спецыялісту па сацыяльна-культурнай дзейнасці. Кароткі аналіз стану айчынных рынкаў працы і прафесій. Рэйтынг самых запатрабаваных спецыяльнасцей. Патрабаванні да маладых спецыялістаў і ўзроўню іх падрыхтоўкі. Трансфармацыя прафесійных кампетэнцый спецыяліста па сацыяльна-культурнай дзейнасці ў сучасных умовах.

Партфоліа як збор прац і дасягненняў спецыяліста, якія даюць уяўленне аб узроўні яго майстэрства і практычнага вопыту ў прафесійнай дзейнасці, якінаглядна дэманструе і пацвярджае ўзровень кваліфікацыі, досведу, таленту, крэатыўнасці і прафесійных магчымасцях яго ўладальніка. Неабходнасць фарміраванняпартфоліа з першых крокаў працы ў прафесіі.

### *Тэма 5. Сацыяльна-культурная дзейнасць і навука. Сучасныя тэндэнцыі развіцця сацыяльна-культурнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь*

Характарыстыка базавых паняццяў – катэгорый сацыяльна-культурнай дзейнасці. Эвалюцыя тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці: кароткі гістарычны нарыс. Тэорыя сацыяльна-культурнай дзейнасці ў сістэме навук. Інтэграцыйная функцыя сацыяльна-культурнай дзейнасці ў стаўленні да сацыяльных і гуманітарных навук.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навуковая інфармацыя, яе роля ў падрыхтоўцы студэнтаў ва ўніверсітэце. Праца з рознымі, у тым ліку электроннымі, крыніцамі інфармацыі. Тэхнічныя сродкі навучання. Першасныя і другасныя крыніцы вучэбна-навуковай інфармацыі. Знаёмства з раздзеламі «Рэпазіторый» і «Выданні БДУКМ» на афіцыйным сайце ўніверсітэта.

Выкарыстанне Сусветнай электроннай сеткі для сістэматычнага збору даных і правядзення даследаванняў. Кароткі агляд спецыялізаваных Internet-сэрвісаў: сайтаў базавых акадэмічных структур; сайтаў навукова-даследчых і аналітычных арганізацый, якія займаюцца сацыяльна-культурнай дзейнасцю; сайтаў прафесійных часопісаў.

*Тэма 6. Арганізацыя вучэбнай, навукова-даследчай, самастойнай працы студэнтаў*

Праблемы адаптацыі студэнта-першакурсніка да новага ладу жыцця. Бюджэт часу студэнтаў, планаванне вучэбнага часу і адпачынку з улікам індывідуальнага біярытму (time-management). Развіццё навыкаў самакантролю і прыёмаў псіхалагічнай разгрузкі. Самавыхаванне і самаадукацыя. Арганізацыя самастойнай працы з вучэбна-метадычнай і навуковай літаратурай. Паспяховая падрыхтоўка да залікова-экзаменацыйных сесій.

Мэты і задачы вучэбнай навукова-даследчай дзейнасці студэнтаў. Студэнцкае навуковае грамадства.

Формы ўдзелу студэнтаў у навукова-даследчай працы ў перыяд навучання. Падрыхтоўка дакладаў і афармленне студэнцкіх навуковых прац. Вучэбна-даследчая праца студэнтаў, навуковыя даследаванні ў працэсе семінарскіх заняткаў, вытворчай практыкі, выканання курсавых прац і дыпломных праектаў. Удзел студэнтаў у навукова-даследчых працах (праектах) выпускаючай кафедры і ўніверсітэта.

Міжасобасныя адносіны ў калектыве, іх заканамернасці і праблемы. Асаблівасці зносін з людзьмі розных псіхалагічных тыпаў. Паняцце і асноўныя характарыстыкі прафесарска-выкладчыцкага і студэнцкага калектываў. Фазы жыццёвага цыкла калектыву, яго статутна-ролевай структуры. Умовы фарміравання спрыяльнага сацыяльна-псіхалагічнага клімату ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

калектыве студэнцкай групы. Агульныя правілы «бесканфліктных паводзін» і паводзін у сітуацыі канфлікту, у тым ліку з выкладчыкам, адміністрацыяй універсітэта.

Прыёмы авалодання навыкамі прафесійнай аргументацыі і рыторыкі. Правілы публічнай прамовы, палемікі, адказаў на пытанні. Уменне слухаць канструктыўную крытыку і эфектыўна яе ўспрымаць.

Арганізацыя адпачынку і працэс самаўдасканалення як састаўныя часткі жыцця студэнта-першакурсніка. Патэнцыял розных відаў вольнага часу студэнтаў. Кола гурткоў і самадзейных калектываў у вучэбнай установе і інтэрнаце. Студэнт як арганізатар і кіраўнік гуртка.

Арганізацыя быту і патрабаванні да культуры быту студэнтаў, якія жывуць у інтэрнаце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Тэмы | Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Кіруемая самастойная работа | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя | | |
| 1 | Уводзіны. Мэта, задачы курса. Прафесія «спецыяліст па сацыяльна-культурнай дзейнасці, выкладчык» | 1 | 2 | 1 | апытанне |
| 2 | Спецыяльнасць «сацыяльна-культурная дзейнасць» у кантэксце сусветнай і айчыннай вучэбна-навуковай практыкі | 1 | 2 | 2 | удзел у гульні |
| 3 | Установа сацыяльна-культурнай сферы як сацыяльны інстытут | 2 | 4 | 2 | праверка вынікаў самастойнай работы |
| 4 | Прафесійная кампетэнтнасць – аснова канкурэнтаздольнасці спецыяліста | 2 | 4 | 2 | афармленне партфоліа |
| 5 | Сацыяльна-культурная дзейнасць і навука. Сучасныя тэндэнцыі развіцця сацыяльна-культурнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь | 2 | 4 | 1 | праверка аналізаў |
| 6 | Арганізацыя вучэбнай, навукова-даследчай, самастойнай працы студэнтаў | 2 | 2 | | |
| | **Усяго…** | **10** | **18** | **8** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Воловик, А. Ф.* Педагогика досуга : учебник / А. Ф. Воловик, В. А. Воловик. – М. : Моск. психолого-социальный ин-т : Флинта, 1998. – 232, [8] с. : ил., табл.

2. *Грыгаровіч, Я. Д.*Падрыхтоўка кадраў культуры ў Рэспубліцы Беларусь: сучасны стан і перспектывы / Я. Д. Грыгаровіч, А. І. Смолік, Л. М. Рагачова; Беларус. дзярж. ун-т культуры. – Мінск : [б. в.], 2001. – 155, [2] с. : табл.

3. *Киселева, Т. Г.* Социально-культурная деятельность: учебник / Т. Г. Киселева, Ю. Д. Красильников ; Моск. гос. ун-т культуры и искусств. – М. : [б. и.], 2004. – 539 с.

4. *Козловская, Л. И.*Специалист социокультурной деятельности нового тысячелетия / Л. И. Козловская// Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2005. – № 5. – С. 74–79.

5. *Паўлава, С.А.* Уводзіны ў спецыяльнасць: метад. дапам. / С. А. Паўлава / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : [б. в.], 2009. – 54, [ 1] с.

*Дадатковая*

1. *Аксюцік, М.І.* Сацыяльна-культурная дзейнасць: вучэб.-метад. дапам. / М.І.Аксюцік. – Мінск : ІСВ, 2003. – 101 с.

2. *Ариарский, М.А.* Прикладная культурология как область научного знания и социальной практики / М. А.Ариарский; С.-Петерб. гос. ун-т культуры и искусств. – СПб., 1999. – 530 с.

3. *Беларусы.*Т. 6. Грамадскія традыцыі / В. Ф. Бацяеў [і інш.] ; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі ; рэдкал.: В. М. Бялявіна, М. Ф. Піліпенка, І. У. Чаквін. – Мінск : Беларус. навука, 2002. – 605, [1] с. : іл.

4.*Болотова, М. И.* Организация семейного досуга в образовательной среде учреждения дополнительного образования детей / М. И. Болотова. – М. : Компания Спутник +, 2005. – 52 с.

5. *Грыгаровіч, Я. Д.* Прыкладная культуралогія: вучэб. дапам. / Я. Д. Грыгаровіч, А. І. Смолік; Беларус. дзярж. ун-т куль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

туры і мастацтваў. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2005. – 215 с.

*6. Дуликов, В. З.* Социально-культурная работа за рубежом: учеб.пособие / В. З. Дуликов. – Изд. 3-е, доп. – М.: МГУКИ, 2011. –199 с.

*7. Каралёў М. М.* Асноўныя кірункі падрыхтоўкі менеджараў сацыяльна-культурнай сферы / М. М. Каралёў // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры. – 2002. – № 1. – С. 61–65.

*8. Ковальчук, А. С.* Основы имиджелогии и делового общения : учеб. пособие для студентов вузов / А. С. Ковальчук. – Ростов н/Д: Феникс, 2004. – С. 25–84.

*9.* Культурно-досуговаядеятельность : учебник для вузов культуры и искусств / под науч. ред. А. Д. Жаркова, В. М. Чижикова ; Моск.гос.ун-т культуры и искусств. – М.:[б. и.], 1998. – 461 с.

*11. Ландэ, Д. В.*Поиск знаний в Internet. Профессиональная работа / Д. В. Ландэ. – М.: Вильямс, 2005. – 272 с.

*12. Макарава, А. А.* Клубныя ўстановы як суб’ект рэалізацыі прыярытэтаў дзяржаўнай культурнай палітыкі / А. А. Макарава // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры. – 2003. – № 2. – С. 89–95.

*13. Мойсейчук, С. Б.* Художественно-творческая деятельность детей-инвалидов: (вопросы социально-психологическойреабилитации) / С. Б. Мойсейчук. – Минск: Веды, 2001. – 110 с.

*14.* Практыкаяк састаўная частка прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў для сацыякультурнай сферы: матэрыялы рэсп. навук.-метад. канф., 1–2 лют. 2000 г. / Беларус. ун-т культуры; рэдкал.: А.І.Смолік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2000. – 202 с.

*16.* Социокультурнаядеятельность как средство воспитания личности: пособие для соц. педагогов и рук. учреждений образования / под общ. ред. В. Н. Наумчика. – Минск: Выш. шк., 2004. – 143 с.

*17.* Технологиясоциально-культурной деятельности : учеб.-метод. пособие для студентов учреждений высш. образования по специальности 1-23 01 14 Социально-культурная деятельность / Л. И. Козловская [и др.]; Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск : БГУКИ, 2014. – 205 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*18.* Формированиевоспитывающей социально-культурной среды в общежитиях учебных заведений: материалы респ. сем.-практикума, Мозырь, 20–21 окт. 1999 г. / Мозыр.гос.пед.ин-т им.Н. К. Крупской; под общ.ред.В.В. Валетова. – Мозырь, 1999. – 187 с.

*19. Ярошенко, Н.Н.* Социально-культурная деятельность: парадигмы, методология, теория / Н. Н. Ярошенко ; Моск. гос. ун-ткультурыи искусств. – М.: МГУКИ, 2000. – 204 с.

*Электронныя рэсурсы*

www.kultura.by/ М-ва культуры Рэсп. Беларусь

http://repository.buk.by:8080/jspui/ Рэпазіторый БДУКМ

*Казанцева, В.В.* Функции и направления деятельности специалистов социально-культурной сферы /В.В. Казанцева // Сиб. пед. журнал. – 2007. – № 7. – С. 168–174 ; То же [Электронный ресурс]. – URL: http://cyberleninka.ru/article/n/funktsii-i-napravleniya-deyatelnosti-spetsialistov-sotsialno-kulturnoy-sfery.

*Круглова, Т.Ю.* Сущностная характеристика понятия «социально-культурная деятельность» / Т. Ю. Круглова // Вестн. ОГУ. – 2005. – № 4. – С. 146–149 ; То же [Электронный ресурс]. – URL: http://vestnik.osu.ru/2005_4_1/27.pdf.

*Фалеева, Л.В.* Организация процесса формирования культуры самоорганизации студентов бакалавриата/Л.В. Фалеева // Совр. проблемы науки и образования. – 2013. – № 1. – С. 201 ; То же [Электронный ресурс]. – URL: http://cyberleninka.ru/article/n/organizatsiya-protsessa-formirovaniya-kultury-samoorganizatsii-studentov-bakalavriata.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Заданні і кантрольныя мерапрыемствы кіруемай самастойнай работы студэнтаў

| Тэма | Коль-касць гадзін | Форма прадастаўлення |
|---|---|---|
| *Тэма 2. Спецыяльнасць «сацыяльна-культурная дзейнасць» у кантэксце сусветнай і айчыннай вучэбна-навуковай практыкі.* Неаходна прааналізавацьсайт універсітэта (кафедры) і падрыхтавацца да гульні «Хто ёсць хто ва ўніверсітэце?» | 2 | пісьмовы аналіз |
| *Тэма 3. Установа сацыяльна-культурнай сферы як сацыяльны інстытут.* Неабходна прааналізаваць дзейнасць пэўнай сацыяльна-культурнай установы па плане | 2 | выступленне на семінары |
| *Тэма 4. Прафесійная кампетэнтнасць – аснова канкурэнтаздольнасці спецыяліста.* Правесці самадыягностыку і падрыхтаваць тэзісы да круглага стала | 2 | афармленне партфоліа |
| *Тэма 5.Сучасныя тэндэнцыі развіцця сацыяльна-культурнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь.* Правесці аналіз сацыяльна-культурных мерапрыемстваў па плане | 2 | афармленне аналізаў у дзённіках назіранняў |

## Пералік сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці па дысцыпліне «Уводзіны ў спецыяльнасць»

Для выяўлення ўзроўню вучэбных дасягненняў студэнтаў рэкамендуецца выкарыстоўваць дыягнастычны інструментарый, які мае markознаўзроўневы характар і рэалізуецца комплексна. У якасці такіх сродкаў кантролю і ацэнкі ведаў па дысцыпліне «Уводзіны ў спецыяльнасць» могуць выкарыстоўвацца:

1) вусныя апытанні на практычных занятках;
2) праверкі вынікаў самастойнай працы;
3) напісанне эсэ па тэмах дысцыпліны;
4) удзелу гульнях;
5) састаўленне партфоліа;
6) падрыхтоўка прэзентацый.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

# УВОДЗІНЫ Ў СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2017. Фармат 60x84 $^1/_{16}$.
Папераафісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,93. Ул.-выд. арк. 0,55. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнаевыкананне:
установаадукацыі
«Беларускідзяржаўныўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчаннеабдзяржаўнайрэгістрацыівыдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальнікадрукаваныхвыданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ